• совершенствование работы по повышению квалификации специалистов по вопросам международного сотрудничества.

Необходимо также учесть, что отсутствие бюджетного финансирования может негативно сказаться на развитии международного сотрудничества и расширении экспорта образовательных услуг.

**Список использованных источников**

1. In-bound students in select countries // Project Atlas and UNESCO, 2016 [Electronic resource]. – Mode of access: http:// www.iie.org /. – Date of access: 10.01.2018.

2. *Ларионова, М. В.* Экспорт российских образовательных услуг: задачи и условия повышения конкурентоспособности и развития экспортного потенциала (позиции российских вузов по итогам социологического опроса) [Электронный ресурс] / М. В. Ларионова. – Режим доступа: http://edu.znate.ru/docs/37/index-447691.html. – Дата доступа: 14.02.2018.

3. Официальный сайт Министерства образования и науки Российской Федерации [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://минобрнауки.рф/проекты/экспорт-российского-образования. – Дата доступа: 12.02.2018.

4. Официальный сайт Министерства образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.edu.gov.by/news/v-belorusskom-gosudarstvennom-ekonomicheskom-universitete-sostoyalas-itogovaya-kollegiya-ministerstv/?sphrase_id=25237/. – Дата доступа: 29.01.2018.

**(Дата подачи: 23.02.2018 г.)**

*С. В. Паноў*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*S. Panov*
National Institut of Higher Education, Minsk

**УДК 373 (476)**

## ШКОЛЬНАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ: ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

## SCHOOL HISTORY EDUCATION: STAGE OF DEVELOPMENT IN THE REPUBLIC OF BELARUS

*Аўтар вызначае храналагічныя этапы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Прапанавана сутнасная характарыстыка вызначаных этапаў. Абазначаны супярэчнасці ў тэорыі і практыцы навучання гісторыі Беларусі ў сярэдняй школе. Аўтар прытрымліваецца пазіцыі вывучэння айчыннай гістарычнай адукацыі як сацыякультурнага феномену.*

*Ключавыя словы: школьная гістарычная адукацыя; этапы развіцця; сацыякультурны феномен; гісторыя Беларусі.*

*Author defines the chronological stages of development of school history education in the Republic of Belarus. Suggested essential characteristic of certain stages. Marked contradictions in the theory and practice of teaching the history of Belarus in the secondary school. The author believes the study of national historical education as a sociocultural phenomenon.*

*Key words: school history education; stages of development; sociocultural phenomenon; history of Belarus.*

Больш чым 25-гадовы вопыт мадэрнізацыі зместу і структуры айчыннай школьнай гістарычнай адукацыі патрабуе свайго аналіза, сістэматызацыі і абагульнення як рэфармавання інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як фарміравання сацыякультурнай практык. Значнасць абазначанай працы надае вывучэнне асноўных накірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне распрацоўкі вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі як фактара ўстойлівага развіцця і нацыянальнай бяспекі суверэннай Рэспублікі Беларусь. Працэс фарміравання нашых нацыянальных уяўленняў аб сваім гістарычным мінулым, які распачаўся з афармлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, патрабуе вызначэння храналагічных этапаў развіцця і надання ім сутнасных характарыстык. Пры гэтым аўтар прытрымліваецца пазіцыі вывучэння гістарычнай адукацыі як сацыякультурнага феномену з выкарыстаннем і раскрыццём узаемасувязей паміж канцэптамі «грамадзянская нацыя», «беларуская дзяржаўнасць», «гістарычная памяць», «нацыянальная ідэнтычнасць», «агульнанацыянальная ідэя».

Для пачатку мэтазгодна вызначыць супярэчнасці ў тэорыі і практыцы гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, якія патрабуюць свайго вырашэння на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі. Сярод іх можна адзначыць:

• паміж запатрабаванасцю гістарычнай адукацыяй для свайго далейшага развіцця выкарыстання назапашанага вопыту рэфармавання і адсутнасцю навукова абгрунтаваных тэарэтыка-метадалагічных асноў і заканамернасцей мадэрнізацыі айчыннай гістарычнай адукацыі;

• паміж стратэгічнымі мэтамі гістарычнай адукацыі і фрагментарным станам гістарычных ведаў (гістарычнай культуры) у сучасным беларускім соцыўме;

• паміж сістэмай каштоўнасцей беларускага соцыўма і іх неактулізаванасцю ў змесце гістарычнай адукацыі;

• паміж акадэмічнай гістарычнай навукай і дыдактыкай гісторыі пры вызначэнні праграмнага зместу вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі» з пазіцый адпаведна фундаментальнасці ведаў і іх сацыяльнай (асабістай з боку вучняў) запатрабаванасцю ў працэсе фарміравання іх жыццёвага вопыту;

• паміж адборам пераважна навуковых ведаў у змест гістарычнай адукацыі і дыдактычным канструяваннем вучэбных ведаў у выглядзе культурна-гістарычных аналагаў (культурна афомленых узораў сацыяльных паводзін ці сацыяльных норм) для развіцця эмацыянальна-каштоўнаснай сферы асобы вучняў;

• паміж лінейным і канцэнтрычным прынцыпамі структуравання зместу гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь на ўзроўні агульнай базавай і сярэдняй адукацыі і дубліраваннем яе зместу на ўзроўні вышэйшай адукацыі (на негістарычных спецыяльнасцях);

• паміж кансалідуючай (прымiраючай) функцыяй гістарычнай памяці як якасці асобы і практыкамі ўжывання ў вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі стэрэатыпаў гістарычнага мыслення, заснаваных на пастулатах класавай барацьбы.

Пры вывучэнні этапаў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь аўтарам улічваюцца даследаванні праблем станаўлення нацыянальнай гістарычнай адукацыі (І. І. Багдановіч) [1], аналіз працэсаў, звязаных з фарміраваннем новай канцэпцыі гісторыі Беларусі ў сістэме сярэдняй агульнаадукацыйнай школы ў 1980–1990-е гг. (В. П. Вірская) [2], сістэматызацыя навукова-гістарычных падыходаў да падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі (А. А. Корзюк) [3].

Зыходным момантам у працэсе развіцця школьнай гістарычнай адукацыі стала прыняцце восенню 1991 г. Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі [4]. Канцэпцыя з’явілася літаральна напярэдадні спынення існавання СССР. У ёй абвяшчаліся прынцыпы дэпартызацыі і дэідэалагізацыі, гуманізацыі і плюралізму, канцэнтрызму ў навучанні, адзінства айчыннай і сусветнай гісторыі, спалучэння фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да разумення грамадска-гістарычных працэсаў. Метадалагічныя пазіцыі Канцэпцыі былі ўдакладнены кіраўніком часовага навуковага калектыву па яе стварэнні М. В. Бічом у 1993 г. і грунтаваліся пераважна на этнакультурнай дамінанце [5]. Вызначаны першы этап у развіцці школьнай гістарычнай адукацыі сваёй храналагічнай мяжой меў 1997 г. Да гэтага года было завершана выданне першага пакалення вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі, якія характарызаваліся перавагай навуковага тэарэтычнага зместу і амаль адсутнасцю метадычнага апарату.

Другі этап развіцця школьнай гістарычнай адукацыі (1997–2002 гг.) вызначаўся падрыхтоўкай другога пакалення вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ва ўмовах пераходу з 1998 г. агульнаадукацыйнай школы на 12-гадовы тэрмін навучання. Другое пакаленне вучэбных дапаможнікаў атрымала метадычна распрацаваны апарат, а таксама свае паралельныя (створаныя альтэрнатыўнымі аўтарскімі калектывамі) выданні. У навукова-метадалагічным аспекце можна адзначыць апору пры канструяванні зместу школьнай гістарычнай адукацыі на нацыянальную гістарыяграфічную канцэпцыю.

Трэці этап у развіцці школьнай гістарычнай адукацыі (2003–2008 гг.) звязаны з увядзеннем у адукацыйны працэс трэцяга пакалення вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі, а таксама з 2004 г. абавязковага факультатыва «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)». Усе тры пакаленні вучэбнай літаратуры рыхтаваліся ва ўмовах рэалізацыі канцэнтрычнага прынцыпу пабудовы зместу гістарычнай адукацыі і ва ўзаемасувязі з вучэбнымі дапаможнікамі па сусветнай гісторыі. Прынцыповым момантам у дыдактычным канструяванні

зместу гістарычнай адукацыі паступова стаў феномен суверэннай беларускай дзяржаўнасці.

Чацвёрты этап развіцця школьнай гістарычнай адукацыі распачаўся ў 2009 г. у сувязі з пераходам агульнаадукацыйнай школы на 11-гадовы тэрмін навучання і працягваўся да 2014 г. У 2009 г. была падрыхтавана Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі», у якой былі абазначаны канцэпты «нацыянальная ідэнтычнасць», «грамадзянская (палітычная) нацыя», «беларуская дзяржаўнасць» [6]. У адпаведнасці з Канцэпцыяй пачаў ажыццяўляцца пераход ад канцэнтрычнага да лінейнага прынцыпу пабудовы зместу гістарычнай адукацыі. Вучэбныя праграмы прадугледжвалі вывучэнне гісторыі ў базавай школе на падзейна-храналагічным, а ў выпускных класах сярэдняй школы – пераважна на праблемна-тэарэтычным узроўнях.

Бягучы пяты этап развіцця школьнай гістарычнай адукацыі можна вызначыць пачынаючы з 2015 г., калі было прынята рашэнне аб пераходзе ад лінейнага да канцэнтрычнага прынцыпу пабудовы зместу вучэбнага матэрыялу. У Нацыянальным інстытуце адукацыі быў падрыхтаваны новы праект Канцэпцыі і вучэбныя праграмы. Канцэптуальным стала сфармуляванае беларускай акадэмічнай гістарычнай навукай палажэнне аб беларускай дзяржаўнасці як «праве этнанацыянальнай супольнасці, патэнцыяльнай здольнасці і магчымасці яе нацыянальнай эліты (палітычнай, эканамічнай, навуковай) да працяглага самастойнага гістарычнага існавання» [7, с. 7–12]. У педагагічнай тэорыі і практыцы з’явілася канцэптуальнае палажэнне аб нацыянальнай ідэі як магчымай аснове для канструявання зместу адукацыі [8, с. 117–118].

У якасці вядучай праблемы пры рэалізацыі на сучасным этапе развіцця зместу гістарычнай адукацыі, які разглядаецца як педагагічна адаптаваны сацыяльны вопыт, можна вызначыць наступную. У адпаведнасці з канцэптуальным палажэннем аб адукацыі як развіццём жыццёвага вопыту тых, хто навучаецца, актуалізуецца аўтарскае бачанне гістарычнай адукацыі як сацыякультурнага феномену [9, с. 25]. Пры гэтым праблемным ва ўмовах транзітыўнага стану беларускага грамадства з’яўляецца літаральная трансляцыя ўжо назапашанага вопыту сучаснаму пакаленню, бо яно разглядаецца не як аб’ект навучання і «кладаўшчык з чужым зместам», а як актыўны суб’ект сацыялізацыі і «будаўнік свайго жыццевага шляху» [10, с. 65–66]. У гэтым выпадку патрабуецца канструяванне зместу школьнай гістарычнай адукацыі як «своеасаблівага люстэрка», у якім вучань зможа ўбачыць свае сацыяльныя і адукацыйныя запыты. Дадзеныя абставіны абумоўліваюць мэтазгоднасць увядзення ў змест сучаснай школьнай гістарычнай адукацыі асабіста запатрабаваных вучнямі феноменаў індывідуальнай гістарычнай памяці пры актуалізацыі яе калектыўнага складніку, арыентаванага на фарміраванне каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Трэба заўважыць, што памяць з’яўляецца адной з характарыстык

інтэлектуальнага развіцця асобы. Працэс трансляцыі ўзораў сацыяльных норм (культурна афармленых узораў паводзін), запатрабаваных вучнямі з пазіцыі традыцыйных каштоўнасцей, дазволіць актывізаваць эмацыянальна-каштоўнасную сферу асобы.

Такім чынам, канцэптуальныя падыходы да рэфармавання школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь трансфарміраваліся ад пераважна этнакультурнай да нацыянальна-дзяржаўнай кампаненты зместу. Вызначаныя аўтарам этапы развіцця гістарычнай адукацыі (на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі) улічваюць падрыхтоўку пяці пакаленняў вучэбнай літаратуры пераважна па гісторыі Беларусі, якая як вучэбны прадмет набыла сваю самастойнасць і вызначае фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці вучняў. Прапанаваныя храналагічныя межы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы маюць прыкладны характар, бо пакаленні вучэбных дапаможнікаў мелі сваім працягам гады выдання, якія выходзяць за пазначаныя рамкі, але канцэптуальна належаць да таго ці іншага пакалення. Увядзенне кантэкста развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як сацыякультурнага феномена звязана з паступовым складваннем у сацыякультурным і навукова-адукацыйным асяроддзі феноменаў «грамадзянская нацыя», «беларуская дзяржаўнасць», «гістарычная памяць», «нацыянальная ідэнтычнасць», «агульнанацыянальная ідэя» і іх змястоўным напаўненнем у працэсе дыдактычнага канструявання зместу адукацыі для развіцця інтэлектуальнай сферы асобы вучняў і ўздзеяння на іх эмацыянальна-каштоўнасную сферу.

Канцэптуальныя асновы мадэрнізацыі гістарычнай адукацыі у Рэспубліцы Беларусь магчыма ўдакладніць з улікам палажэнняў новай рэдакцыі Канцэпцыі навучання гісторыі ў агульнаадукацыйнай школе, распрацаванай у межах НДР з удзелам аўтара артыкула. Прынцыпы адбору зместу вучэбнага матэрыялу вызначаюцца дыдактычнымі прынцыпамі канструявання зместу гістарычнай адукацыі ў адпаведнасці з культуралагічнай канцэпцыяй зместу адукацыі і рэалізацыяй кампетэнтнаснага падыходу да вынікаў выхавання і навучання. Магчыма вызначыць наступныя:

• прынцып культурна-гістарычнага асяроддзя, які прадугледжвае трансляцыю і засваенне вучнямі дасягненняў прадстаўнікоў беларускай нацыі ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама ідэй (думак) і каштоўнасных арыентацый чалавека ў гісторыі з вызначэннем пераемнасці з сучаснасцю;

• прынцып адзінства выхавання і навучання, які арыентаваны на фарміраванне нацыянальнай і грамадзянскай ідэнтычнасці, калектыўнай гістарычнай памяці як прыміраючай, а таксама сістэмы традыцыйных (сям’я і каханне, сяброўства і ўзаемадапамога, працалюбства, рэлігійная талерантнасць) і інавацыйных каштоўнасных арыентацый (дзяржаўны суверэнітэт, паважлівыя адносіны да іншых поглядаў);

• прынцып дыскрэтнасці зместу навучання, які абумоўлівае першапачатковае прадстаўленне вучэбнага матэрыялу, упарадачанае з пункту гледжання педагагічнай мэтазгоднасці засваення найбольш вызначальных гістарычных падзей (грамадскіх працэсаў) і сацыяльных паводзін гістарычных асоб пры захаванні магчымасці далейшага пашырэння аб'ёму вучэбнага матэрыялу ў працэсе яго вывучэння на другім канцэнтры ў выпускных класах;

• прынцып антрапалагізацыі навучання, які абумоўлівае засваенне зместу вучэбнага матэрыялу па алгарытму «чалавек – культура – гісторыя» пры рэалізацыі кантэкстнага падыходу да асвятлення ўчынкаў суайчыннікаў і равеснікаў у гістарычным і сучасным грамадска-палітычным, сацыяльна-культурным асяроддзі з улікам матывацыйнага кампаненту асобы;

• прынцып адзінства змястоўнага і працэсуальнага бакоў навучання, які прадвызначае рэалізацыю дзейнаснага (кампетэнтнаснага) падыходу да падрыхтоўкі вучняў праз засваенне спосабаў дзейнасці са зместам вучэбнага матэрыялу і магчымых сацыяльных практык, у тым ліку мадэліравання сваіх верагодных паводзін у прапанаваных гістарычных сітуацыях, умоўнага інтэрв'юіравання гістарычных асоб, пошуку супярэчнасцей (парадоксаў);

• прынцып нагляднасці і даступнасці ў навучанні згодна з узроставымі і псіхолага-педагагічнымі асаблівасцямі вучняў, які рэалізуецца праз стварэнне дакументальна-візуальных вобразаў гістарычных падзей і іх удзельнікаў і прызнанне права вучняў на пэўную суб'ектыўнасць у працэсе першапачатковага засваення зместу з далейшай карэляцый яго вынікаў з боку настаўніка;

• прынцып вобразнасці навучання з дапамогай мастацкіх сродкаў для актуалізацыі эмацыянальна-каштоўнаснага кампаненту асобы, фарміравання вопыту яе пачуццёвых адносін да зместу вывучаемага матэрыялу і магчымага яго пераводу ў доўгачасовую памяць вучняў з дапамогай мультысэнсарных прыёмаў.

Гісторыка-педагагічныя заканамернасці развіцця школьнай гістарычнай адукацыі былі звязаны з трансфармацый структуры і зместу гістарычнай адукацыі пры рэалізацыі канцэнтрычнага прынцыпу пабудовы зместу гістарычнай адукацыі і далейшых пераходах да лінейнага і зноў да канцэнтрычнага прынцыпащ. Аўтарскае даследаванне, праведзенае метадам анкетавання настаўнікаў гісторыі (145 рэспандэнтаў, лістапад 2017 г. – люты 2018 гг., курсы па праграмах павышэння кваліфікацыі ў Мінскіх гарадском і абласном інстытутах развіцця адукацыі, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, навукова-метадычны семінар у Нацыянальным інстытуце адукацыі), сведчаць аб наступным. 28 % апытаных падтрымалі лінейны прынцып пабудовы зместу гістарычнай адукацыі на падставе таго, што дадзеная структура на працягу ўсяго перыяда навучання ў сярэдняй школе дазваляе разгарнуць змест вучэбнага матэрыялу паслядоўна па храналагічных перыядах і лагічна, а змест самай складанай для вучняў навейшай гісторыі прыходзіцца па часе свайго вывучэння на старшакласнікаў, чый узрост дазваляе засвоіць гэты змест асэнсавана. Сярод выказаўшых у падтрым-

ку так званай «лінейкі» пераважалі настаўнікі першай кваліфікацыйнай катэгорыі з сярэднім стажам педагагічнай працы ў 17 гадоў. 77 % апытаных выказаліся за канцэнтрычны прынцып пабудовы зместу гістарычнай адукацыі. Сярод іх пераважалі настаўнікі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі з сярэднім стажам педагагічнай працы 22 гады. Іх аргументацыя тычылася магчымасці больш асэнсаванага і цэласнага (не фрагментарнага) засваення вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу на падставе яго паўтарэння (не дубліравання) на праблемна-тэарэтычным узроўні, прадстаўлення і засваення розных пунктаў гледжання на больш познім этапе сацыяльнага сталення вучняў з улікам назапашанага імі адукацыйнага і жыццевага вопыту, адпаведнасці канцэнтраў пазнавальным магчымасцям вучняў. Таксама былі названы практыка-арыентаваныя аргументы, звязаныя з больш паспяховай і якаснай падрыхтоўкай вучняў да выпускных экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання. Выніка анкетавання ускосна даюць падставу для сцвярджэння аб дыдактычнай перавазе канцэнтрычнага прынцыпу пабудовы зместу гістарычнай адукацыі, які рэалізуецца на сучасным этапе яе развіцця.

У перспектве бачыцца далейшы працяг даследавання па сістэматызацыі, абагульненні і выкарыстанні вопыту мадэрнізацыі структуры і зместу школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь на аснове сінтэза сацыетарнай і культуралагічнай парадыгм адукацыі для вызначэння інавацыйных перспектыў развіцця.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Багдановіч, І. І.* Методыка выкладання гісторыі ў школе / І. І. Багдановіч. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2009. – С. 47–65.

2. *Вирская, В. П.* Формирование новой концепции истории Беларуси в системе средней общеобразовательной школы (1980–1990-е гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. П. Вирская; Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск, 2004. – 24 с.

3. *Корзюк, А. А. В*ывучэнне гісторыі Беларусі ў сярэдняй школе (канец 1950-х–2010-я гады) / А. А. Корзюк // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 4. – С. 45–59.

4. Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі // Настаўніцкая газета. – 1991. – 30 ліст. – С. 2–3.

5. *Біч, М. В.* Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі / М. В. Біч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 15–24.

6. Концепция учебного предмета «Всемирная история. История Беларуси» // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. – № 6. – С. 14–17.

7. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Минск: Беларус. навука, 2011. – Кн. 1. – 584 с.

8. *Хуторской, А. В.* Дидактика: учебник для вузов / А. В. Хуторской // Стандарт третьего поколения. – СПб.: Питер, 2017. – 720 с.

9. *Новиков, А. М.* Основания педагогики. Пособие для авторов учебников и преподавателей / А. М. Новиков. – М.: Изд-во «Эгвес», 2010. – 208 с.

10. *Король, А. Д.* Куда идет педагогика: «Логос» и «Дао» образования / А. Д. Король // Беларуская думка. – 2016. – № 6. – С. 64–67.


**(Дата подачи: 28.02.2018 г.)**